# СІСТЭМА, ЗМЕСТ, ПЕРСПЕКТЫВЫ ПАТРЫЯТЫЧНАГА ВЫХАВАННЯ Ў МУЗЕЯХ

**М. А. Бяспалая,**
*загадчык кафедры гісторыі Беларусі і музеязнаўства Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта культуры і мастацтваў, доктар гістарычных навук, прафесар*

Патрыятызм – любоў да сваёй Айчыны, да свайго народа – адно з найбольш глыбокіх пачуццяў, замацаваных тысячагоддзямі. Пачуццё патрыятызму вызначала паводзіны людзей ужо ў далёкай старажытнасці. Пад патрыятычнымі заклікамі адбываліся вялікія справы, якія фарміравалі падмурак сацыяльна-эканамічнага развіцця розных цывілізацый – ад Антычнасці да сучаснасці. Патрыятычны змест выразна прасочваецца ў галоўным прынцыпе, пакладзеным у аснову сацыякультурнага жыцця Старажытнай Грэцыі («Усё ў імя поліса») і Старажытнага Рыма («Усё ў імя Рыма»). Такі ўнутраны настрой дапамагаў прадстаўнікам полісаў перамагаць на алімпійскіх гульнях, тым самым праслаўляць поліс, паспяхова змагацца з ворагам, умацоўваць уладу Рыма над «кругам зямель».

Любоў да Радзімы была рухавіком слаўных спраў, якія ажыццяўлялі нашы продкі ва ўсе перыяды і ва ўсіх кірунках сацыякультурнага развіцця Беларусі. Аднак трэба прызнаць, што вызначальны ўплыў на фарміраванне патрыятызму складаюць ратныя подзвігі нашых продкаў. Той маральны ўздым, які аб’ядноўвае і суправаджае людзей у барацьбе за справядлівую справу – абарону Айчыны, ператвараецца ў калектыўную памяць, якая перадаецца з пакалення ў пакаленне і ўвесь час папаўняецца новымі прыкладамі. Дзяржава, як структура, што фарміруе сацыяльна-эканамічнае і культурнае жыццё кожнага народа, не можа ігнараваць неабходнасць узвелічэння подзвігаў сваіх грамадзян, выразныя станоўчыя дасягненні мінулага на розных этапах сацыякультурнага развіцця.

Сістэма патрыятычнага выхавання, без якога не абыходзіцца ні адна краіна, перажывае пэўныя змены на кожным гістарычным этапе. Напрыклад, у 1920-я гг. для нашай краіны і народа вельмі хвалюючымі заставаліся ўспаміны аб барацьбе з польскімі акупантамі. Імёны загінуўшых увекавечаны ў назве вуліц, школ

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

(Дукорская сямігодка імя 16-ці партызан), адкрываліся помнікі і мемарыяльныя дошкі ў іх гонар. У гэты перыяд фарміраваліся першапачатковыя звёны сістэмы патрыятычнага выхавання – пачатковыя і сярэднія школы, дзе навучалася асноўная колькасць дзяцей, школы ФЗН, першыя ВНУ з іх камсамольскімі арганізацыямі. Пэўнае месца ў сістэме патрыятычнага выхавання пачалі займаць краязнаўчы рух і першыя музеі, створаныя ў Савецкай Беларусі.

Зместам патрыятычнага выхавання станавілася фактычна кожная станоўчая, з пункту гледжання афіцыйнай ідэалогіі, з’ява сацыякультурнага жыцця. Аб умелым і творчым падыходзе да арганізацыі патрыятычнага выхавання савецкіх людзей з боку камуністычнай партыі і савецкай дзяржавы напісана шмат. Трэба адзначыць, што музеі 1920–1930-х гг. таксама дзейнічалі ў афіцыйным русле і адлюстроўвалі ў сваіх экспазіцыях і культурна-адукацыйнай дзейнасці дасягненні савецкай улады ў гэты перыяд.

Патрыятызм і гераізм савецкіх людзей у гады Вялікай Айчыннай вайны знайшоў сваё увасабленне ў цудоўных музычных творах, вершаваных і празаічных радках, малюнках, плакатах і г.д. Гэтая багатая спадчына стала падмуркам фарміравання калектыўнай народнай памяці аб подзвігу савецкага народа ў гады вайны, які грунтаваўся на глыбокай любові да Радзімы. Паказальна, што падчас ваенных дзеянняў прымаюцца рашэнні аб назапашванні прадметаў музейнага значэння, якія выразна адлюстроўвалі б гераізм народа на фронце, у савецкім і варожым тылах і якія маглі б скласці экспазіцыі будучых музеяў. Для нашай краіны самы яркі прыклад – этапы стварэння Беларускага дзяржаўнага музея гісторыі Вялікай Айчыннай вайны.

Адразу пасля перамогі ў Вялікай Айчыннай вайне не было патрэбы ва ўдасканаленні сістэмы патрыятычнага выхавання, таму што яна існавала і пацвярджала сваю эфектыўнасць, пераможцам у жорсткім змаганні з ворагам адчуваў сябе ўвесь народ.

Змена пакаленняў, паступовы адыход удзельнікаў вайны выклікалі неабходнасць актуалізацыі патрыятычнага выхавання, распрацоўкі новага зместу і формаў. Нам падаецца, што найбольш эфектыўная яго сістэма склалася ў канцы 1960 – пачатку 1970-х гг., калі стала відавочным змяншэнне колькасці ветэранаў вайны, падрастанне новага пасляваеннага пакалення.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Музеі, якія актыўна працягвалі збіраць і захоўваць прадметы музейнага значэння часоў вайны,ператварыліся ў адны з галоўных цэнтраў патрыятычнага выхавання. Назапашаныя музейныя прадметы станавіліся асновай новых экспазіцый, напрыклад, у Беларускім дзяржаўным музеі гісторыі Вялікай Айчыннай вайны, Нацыянальным гістарычным музеі Рэспублікі Беларусь, ці новых музеяў – мемарыяльны комплекс «Брэсцкая крэпасць-герой», Віцебскі абласны музей Героя Савецкага Саюза М.Ф. Шмырова і інш.

З’явіліся больш відовішчныя, чым традыцыйная экскурсія, формы культурна-адукацыйнай (у тыя часы культурна-асветніцкай) дзейнасці. Неперадаваемае эмацыянальнае ўздзеянне аказвалі ўрачыстыя мерапрыемствы, што адбываліся ў музеях, такія як урокі мужнасці, прыняцце прысягі, прыём у піянеры, у якіх абавязкова ўдзельнічалі ветэраны – франтавікі ці партызаны. Шырока практыкаваліся сустрэчы з ветэранамі падчас экскурсій, тэматычных вечароў. Музеі пачалі актыўна ствараць перасоўныя выставы, з якімі наведвалі самыя аддалёныя месцы краіны. Напрыклад, супрацоўнікі музея Вялікай Айчыннай вайны аб’ездзілі многія воінскія часці, населеныя пункты, пабывалі нават на БАМе. Своеасаблівым апафеозам патрыятычнага ўздыму было шэсце ветэранаў 3 ліпеня 1974 г. па Ленінскім праспекце ў Мінску, у якім прынялі ўдзел тысячы людзей.

Сучасныя сацыякультурныя ўмовы (з іх неабмежаванымі тэхнічнымі магчымасцямі) вымагаюць выпрацоўкі новага зместу патрыятычнага выхавання. Не апошнюю ролю ў гэтым выконвае так званы крызіс «ідэнтыфікацыі», калі малады чалавек аказваецца не ў стане дакладна вызначыць сваю пазіцыю ў адносінах да існуючай сістэмы каштоўнасцей. Расійскі культуролаг В.А. Кутыроў прыводзіць вельмі ёмкую характарыстыку сучаснай сітуацыі: «Усюды тое самае апранаюць, ядуць, п’юць, спяваюць, усюды Дыснэйлэнд і Макдональдс. Своеасаблівасць народаў сыходзіць у мінулае, у традыцыю, у фальклор і існуе як перажытак мінулага. Калі б у гарадах не было старых кварталаў і музеяў, то падарожнічаць было б зусім бессэнсоўна. Чалавек непазбежна трапляе ў асяроддзе аднолькавых аўтамабіляў, дызайн-будынкаў, яго паўсюдна пераследуюць рэкламы транснацыянальных карпарацый. Чалавек ператвараецца з сацыякультурнай асобы ў чалавечы фактар тэхнасу». Праз магчымасць лёгкіх і разнастайных культурных, прафесійных, сацыяльных і іншых кантактаў

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

сціраецца паступова мяжа самаідэнтыфікацыі. Перад сучасным грамадствам стаіць задача пошуку новых формаў і эфектыўных кірункаў патрыятычнага выхавання.

Безумоўна, у аснове патрыятызму – любоў да Радзімы, аднак адмаўляць прысутнасць у ім нацыянальнай ідэі таксама няма падстаў. Крыніцамі яе перш за ўсё з'яўляецца гісторыя, якую дасканала вывучаюць, каб даказаць правы нацыі на сваю зямлю – Радзіму. Дзе захоўваецца, вывучаецца і, галоўнае, транслíруецца гісторыка-культурная спадчына? У музеі. Таму роля музеяў рознай падпарадкаванасці і іх значэнне ў патрыятычным выхаванні толькі ўзрастаюць. У першую чаргу ўзрастае роля школьных музеяў, таму што яны ствараліся настаўнікамі разам з вучнямі, і, па-першае, гэта ўжо ёсць падстава для фарміравання пачуцця гордасці за зробленую справу. Па-другое, не трэба траціць час на пераезды, формы культурна-адукацыйнай работы можна распрацоўваць і ўжываць самыя разнастайныя.

Даследчыкі ролі музеяў у грамадстве прадугледжваюць, што інфармацыя ў будучым будзе перадавацца з дапамогай карцін, гісторыі, міфаў, легенд (замест літар і лічбаў). Менавіта карціны павінны стаць новай агульнай мовай – lingua franka. Самымі запатрабаванымі стануць пачуцці пастаянства і пераемнасці. Людзі захочуць гісторый са «старых добрых часоў»… Людзі будуць купляць эмоцыі, гісторыі і новы вопыт. Менавіта гісторыя стане асноўным аб'ектам куплі-продажу.

Безумоўна, такое заключэнне, з аднаго боку, не ўнушае аптымізму, з другога – працуе на прэстыж музейнай справы, таму што гісторыка-культурная спадчына захоўваецца і транслíруецца музеем. Менавіта на яе аснове магчыма далейшае ўдасканаленне сістэмы і зместу патрыятычнага выхавання.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ